# АДЗІН ДРУГОГА ДАВОДЗІЦЬ ДА ЛІХОГА
*(З народнага)*

Прачытайце і адгадайце загадкі.

1. Маленькі шарык
Пад лаўкай шарыць,
Збірае крошкі,
Баіцца кошкі.

*Н. Гілевіч.*

акшым

2. Ён па лесе скок ды скок,
Косіць вокам з боку ў бок.
У дупле вавёрка — шчоўк!
А яму здаецца — воўк.

*У. Мацвеенка.*

цяаз

3. Калі вецер
Дзьме халодны,
Ён блукае
Злы, галодны.

*З народнага.*

кўов

Па-лі́-ца — полка ў шафе ці на сцяне.
Са́-жа-лка — невялічкае возера, якое выкапаў чалавек.
Ра-га-ту́-ха — тая, якая гучна смяецца.


Правообладатель Национальный институт образования

Прачытайце назву казкі і два першыя сказы. Што магло здарыцца? Прачытайце казку. Хто выратаваў Муху-пяюху з сябрамі?

## Муха-пяю́ха

*Беларуская народная казка*

Жыла-была Муха-пяюха. Мела яна каляску і шэсць ка-ма-роў. За-прэ-гла Муха-пяюха камароў у каляску ды па-е-ха-ла на па-гу-лян-ку.

Едзе яна дарогаю, едзе шы-ро-ка-ю — бяжыць мышка:

— Добры дзень, пані! Як паню зваць-велічаць?

— Я Муха-пяюха. А ты хто?

— А я Па Па-лі́-цах Скра-ба-ту́-ха.

— Сядай, паедзем разам.

Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — скача жабка:

— Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?

— Муха-пяюха.

— Па Паліцах Скрабатуха. А ты хто?

— А я Па Сажалках Ра-га-ту-ха.

Правообладатель Национальный институт образования

— Сядай, паедзем разам.

Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — сядзіць на галінцы вавёрка:

— Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?

— Муха-пяюха.

— Па Паліцах Скрабатуха.

— Па Сажалках Рагатуха. А ты хто?

— А я Па Е́лках Скаку́ха.

— Сядай, паедзем разам.

Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — бяжыць заяц:

— Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?

— Муха-пяюха.

— Па Паліцах Скрабатуха.

— Па Сажалках Рагатуха.

— Па Елках Скакуха. А ты хто?

— А я Праз Дарогу Скок.

— Сядай, паедзем разам.

Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — ідзе воўк:

— Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?

— Муха-пяюха.


Правообладатель Национальный институт образования

— Па Паліцах Скрабатуха.

— Па Сажалках Рагатуха.

— Па Елках Скакуха.

— Праз Дарогу Скок. А ты хто?

— А я Галодны Воўк. Усіх вас паем!..



Пачулі гэта камары, па-дня-лі-ся ўгору і паляцелі разам з каляскай. А Галодны Воўк па-ля́с-каў зубамі і пайшоў далей ні з чым.

1. Як называлі сябе муха, мышка, жабка, вавёрка, зайчык і чаму?
2. Прачытайце, хто апошнім сустрэўся сябрам. Якім вы ўяўляеце ваўка?
3. Якую рускую народную казку нагадвае казка «Муха-пяюха»? Чым там скончылася казка?
4. Прачытайце казку па ролях.

Закончыце параўнанні. Чаму так гавораць?

Надакучлівы як … .
Рухавы як … .

Пужлівы як … .
Галодны як … .

Правообладатель Национальный институт образования

## АБМЯРКОЎВАЕМ ПРАЧЫТАНАЕ

**1.** Прачытайце загадкі і адгадайце іх. З якіх казак «прыйшлі» гэтыя героі? Якія якасці характару яны праявілі?

Футра рыжае надзела
І ў люстэрка паглядзела:
Гэта што за прыгажуня?
Адгадайце! Не скажу я!

*У. Мацвеенка.*





У стаўку купаўся,
Ды сухім застаўся.
І пайшоў, гарласты,
У чырвоных ластах.

*Р. Барадулін.*

Сядзіць таўстуха пад вярбой,
Сама спрачаецца з сабой.
Убачыць бусла недалёка —
Дык боўць у рэчку з галавой.

*В. Лаўрыновіч.*





Правообладатель Национальный институт образования

**2.** Прыгадайце, хто з казачных герояў гэта казаў: «Я не толькі цябе, а і двух такіх не баюся!»

**3.** Успомніце, якімі словамі Каза-манюка палохала Ваўка і Мядзведзя.

Успомніце словы, якімі Певень выгнаў Казу з зайчыкавай хаткі.

**4.** Якімі словамі пачыналіся казкі, а якімі заканчваліся? Прачытайце.

**5.** Якая казка спадабалася вам больш за іншыя? Чаму?



**6.** Прыдумайце пытанні да казачнай віктарыны «Падарожжа па казках».

Правообладатель Национальный институт образования